*А. М. Лукашэвіч*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*A. Lukashevich*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(476+477)“1303/1305”**

# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СКЛАДЗЕ ГАЛІЦКАЙ МІТРАПОЛІІ КАНСТАНЦІНОПАЛЬСКАГА ПАТРЫЯРХАТУ (1303–1305 ГГ.)

# BELARUSIAN LANDS AS PART OF THE GALICH METROPOLITAN OF THE PATRIARCHATE OF CONSTANTINOPLE (1303–1305)

*У артыкуле даследуюцца малавядомыя ў гістарыяграфіі аспекты ўтварэння самастойнай Галіцкай мітраполіі (1303–1305 гг.), у склад якой уваходзіла адна з беларускіх епархій – Тураўская. У той час яна аб’ядноўвала тэрыторыю Піншчыны, Тураўшчыны і Наваградчыны. Акрамя таго, у склад Уладзімірскай (Валынскай) епархіі ўваходзіла Берасцейшчына. Уключэнне ў склад мітраполіі гэтых тэрыторый стала вынікам складаных палітыка-дзяржаўных працэсаў сярэдзіны XIII – пачатку XIV ст., калі Турава-Пінскае княства і Берасцейская зямля трапілі пад моцны ўплыў або залежнасць ад Галіцка-Валынскай дзяржавы. Зроблена выснова, што далейшы лёс гэтых зямель, а таксама Тураўскай епархіі з’яўляецца важным аспектам пры вызначэнні межаў Літоўскай мітраполіі (з цэнтрам у Наваградку).*

*Ключавыя словы: Тураўская епархія; Галіцкая мітраполія; Канстанцінопальскі патрыярхат; Беларусь; Вялікае Княства Літоўскае; Галіцка-Валынская дзяржава; праваслаўная царква.*

*The article examines little-known aspects in historiography of the formation of the independent Galician metropolis (1303–1305), which included one of the Belarusian dioceses – Turavskaya. Then it united the territories of Pinsk, Turov and Novogrudok regions. In addition, the Vladimir (Volyn) diocese included the Berestey land. The inclusion of these territories into the metropolitanate was the result of complex political and state processes in the mid-13th – early 14th centuries, when the Turovo-Pinsk principality and Beresteyskaya land came under the strong influence or dependence of the Galician-Volyn state. It is concluded that the further fate of these lands, as well as the Turov diocese, is an important aspect in determining the boundaries of the Lithuanian Metropolis (with its center in Novogrudok).*

*Keywords: Diocese of Turov; Metropolis of Galicia; Patriarchate of Constantinople; Belarus, Grand Duchy of Lithuania; Galicia-Volyn State; Orthodox Church.*

У сучаснай гістарыяграфіі ў апошнія гады шмат увагі надаецца канфесійнай гісторыі, у т. л. падзеям, звязаным са стварэннем Літоўскай праваслаўнай мітраполіі з цэнтрам у Наваградку (1315/1317–1330 гг.). Гэтыя аспекты закраналі многія беларускія (С. А. Падокшын [12], С. А. Чарапко [20]), расійскія (Б. Н. Флора [18], Б. Крычэўскі [5]), польскія

(А. Мірановіч [8]), амерыканскія (І. Ф. Мейендорф [7]) і французскія (К. Цукерман [19]) даследчыкі.

Між тым пачатак працэсу ўтварэння самастойнай праваслаўнай мітраполіі ў межах Беларусі быў пакладзены на 15 год раней. У дадзеным выпадку размова ідзе пра Галіцкую мітраполію (1303–1305 гг.). Яна была ўтворана ў межах пераважна Галіцка-Валынскай дзяржавы, магутнасць якой у пачатку XIV ст. дасягнула свайго піку. У склад мітраполіі ўваходзілі землі Берасцейшчыны, Піншчыны, Тураўшчыны і Наваградчыны.

Але лёс гэтай праваслаўнай мітраполіі застаецца менш даследаваным у беларускай гістарыяграфіі. У той жа час гісторыі Галіцкай мітраполіі надавалася шмат увагі расійскімі дарэвалюцыйнымі (Т. В. Барсаў [1], А. С. Паўлаў [11], Н. Д. Ціхаміраў [17], П. П. Сакалоў [16]), польскімі (Е. Фіялек [24], К. Хадыніцкі [23]) і украінскімі (М. І. Гайкоўскі [2], І. Рудовіч [15], М. Чубаты [21], В. Любашчанка [6]) даследчыкамі. Таму спынемся на асноўных аспектах стварэння Галіцкай мітраполіі.

Фарміраванне епархіяльнай структуры праваслаўнай царквы на паўднёва-заходніх землях Русі пачалося ў канцы X ст. У 992/993 г. адной з першых тут была заснавана Валынская епархія, якая аб’яднала землі Валыні і Галіччыны. На думку польскага гісторыка А. Мірановіча, у склад Валынскай епархіі першапачаткова ўваходзілі і беларускія землі – Берасцейшчына і Тураўшчына. Але гэта меркаванне заснавана на гіпотэзе, што Тураўская епархія была ўтворана не ў 1005 г., а толькі пры Святаполку II Ізяславічу (1088–1093), калі Тураўская зямля была ўзнята да рангу княжацкага ўдзела [8, с. 240].

Па меры драблення Русі ўтвараліся новыя палітычныя цэнтры, якія дабіваліся стварэння ўласных епархій. Гэта прывяло да вылучэння з Валынскай епархіі чатырох новых царкоўных адзінак – Перамышльскай (1026 г., па іншых звестках – 1219 г.), Галіцкай (1134 г., па іншых звестках – 1147, 1156/1157 гг.), Уграўскай (1219/1220 г., па іншых звестках – 1223 г., пазней – Холмскай) і Луцкай (1235 г., па іншых звестках – 1288 г.) епархій [8, с. 244].

Пасля мангола-татарскага нашэсця на землях былой Кіеўскай Русі вызначыліся тры цэнтры, якія прэтэндавалі на дзяржаўную гегемонію: паўднёва-заходні (Галіч, Уладзімір), паўночна-заходні (Новагародак, Вільня) і паўночна-ўсходні (Уладзімір-на-Клязьме, Цвер, Масква). Як справядліва адзначаў С. А. Падокшын, калі паўночна-ўсходнія княствы ў сваёй палітычнай дзейнасці абапіраліся галоўным чынам на мангола-татарскіх ханаў, то паўднёва-заходнія, заходнія і паўночна-заходнія землі былой Кіеўскай Русі арыентаваліся на падтрымку заходніх краін і царквы [12, с. 24].

Калі Кіеў стаў небяспечным для праваслаўных мітрапалітаў, яны часцей жылі ў гарадах паўночна-ўсходняй Русі. У 1299 г. пасля чарговага разграблення Кіева мангола-татарамі мітрапаліт Максім (1283–1305) перанёс сваю рэзідэнцыю ва Уладзімір-на-Клязьме. У той час за ўладу ва Уладзіміры вялі барацьбу цвярскі і маскоўскі ўдзельныя князі. Разам з мітрапалітам ва Уладзімір-на-Клязьме перабраўся і ўвесь вышэйшы праваслаўны

клір, а ў Кіеве застаўся вікарый (С. А. Чарапко называе яго «наместнікам») [20, с. 16].

У час знаходжання ва Уладзіміры-на-Клязьме мітрапаліт Максім падтрымаў цвярскога князя Міхаіла Яраславіча, які ў 1305 г. стаў вялікім князем Уладзімірскім (1305–1318). Яле спробы мітрапаліта прымірыць яго з праардынскім маскоўскім князем Юрыем Данілавічам скончыліся няўдачай.

Перамяшчэнне рэзідэнцыі мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі з Кіева ва Уладзімірскую зямлю выклікала незадавальненне іншых рускіх князёў, у першую чаргу кіраўніка Галіцка-Валынскай дзяржавы князя (караля) Юрыя (Георгія) Львовіча. Як адзначаў Я. Я. Галубінскі, калі раней «Кіеў быў нейтральным паміж двума рускімі княжаннямі – уладзімірскім і галіцкім, так што пакуль сталіца мітрапалітаў заставалася на старым месцы, яны маглі быць мітрапалітамі абедзвюх частак ўсяе Русі. Але калі Максім перанёс сталіцу ва Уладзімір, Вялікае княства Галіцкае апынулася ў царкоўным стаўленні ўжо не раўнапраўным з першай часткай мітраполіі, а толькі як бы некаторым да яе прыдаткам» [3, с. 96].

Таму менавіта князь Юрый Львовіч ініцыяваў заснаванне самастойнай мітраполіі з цэнтрам у Галічы. Такім чынам, ён імкнуўся да стварэння ў межах сваіх уладанняў царкоўнай арганізацыі, незалежнай ад мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі і ардынскай улады [12, с. 24; 20, с. 16].

Першыя звесткі пра Галіцкую мітраполію адносяцца да 1303 г., калі яна згадваецца ў *Notitia episcopatuum* – спісе іерархаў, складзеным пры канстанцінопальскіх імператары Андроніцы II Палеолагу (1282–1328) і патрыярху Апанасі I (1289–1293, 1303–1310).

Згодна з меркаваннем расійскага даследчыка Б. М. Флора, межы Галіцкай мітраполіі адпавядалі межам уладанняў князя Юрыя Львовіча: у яе склад увайшлі *Уладзімірская (Валынская), Луцкая, Холмская, Пярэмышльская* і *Тураўская епархіі* (разам з *Галіцкай мітрапалічай вобласцю*) [18]. З такім пералікам епархій пагаджаліся як расійскія дарэвалюцыйныя (Н. Д. Ціхаміраў [17, с. 42], А. С. Паўлаў [11, с. 5]), так і сучасныя [5] даследчыкі, прадстаўнікі ўкраінскай (М. І. Гайкоўскі [2]) і польскай (Е. Фіялек, К. Хадыніцкі, А. Мірановіч [24, s. 492–493; 23, s. 4–5; 8, с. 248]) гістарыяграфіі.

Такое адзінства ў меркаваннях звязана з захаваннем першакрыніцы – *асобнай роспісі рускіх епіскапій, падпарадкаваных мітрапаліту Кіеўскаму і ўсяе Русі* (вядомы ў спісах XIV ст.). У яе канцы было адзначана: «Калі Галіч у Малой Русі ўзведзены был хрысавулам Андроніка Палеалога і сінадальным актам патрыярха Афанасія на ступень мітраполіі, то да гэтай новай мітраполіі аддзелены былі з былой вобласці кіеўскага мітрапаліта *пяць епіскапій: уладзімірская (на Валыні), пярэмышльская, луцкая, тураўская і холмская*» [цыт. па: 11, с. 5], зразумела, і з *галіцкай мітрапалічай вобласцю*.

Але пры гэтым неабходна звярнуць увагу на тое, што ў 1303 г. беларускія землі, аб’яднаныя ў Тураўскай епархіі, не ўваходзілі ў склад Галіцка-

Валынскай Русі. На думку беларускага даследчыка А. Краўцэвіча, «працэс “зліцця” (выраз Мацея Любаўскага) Турава-Піншчыны (і ў яе складзе Клецкага, Дубровіцкага, Слуцкага княстваў) з Літвой быў завершаны ці амаль завершаны пры гаспадарынні Віценя» [4, с. 129], гэта значыць – паміж 1295 і 1315 гг.

Такім чынам, утварэнне Галіцкай мітраполіі прывяло да падзелу мітраполіі Кіеўскай і ўсяе Русі на дзве царкоўныя структуры. У Візантыі Галіцкую мітраполію сталі называць «мітраполіяй Малой Русі», у адрозненне ад «мітраполіі Вялікай Русі».

Першым Галіцкім мітрапалітам (з 1303 г.) быў *Ніфонт* (? – каля 1305 г., верагодна, Галіч) [9]. Імя Ніфонта як першага мітрапаліта Галіцкага згадваецца ў пасланні 1370 г. польскага караля Казіміра III Вялікага да Канстанцінопальскага патрыярха *Філафея* (Ко(к)кіна, 1353–1354, 1364–1376) [22, p. 577; 13, стб. 125–126; 17, с. 42].

Па просьбе князя Юрыя Львовіча Ніфонт быў узведзены ў сан мітрапаліта Канстанцінопальскім патрыярхам Апанасам I. У згаданым *Notitia episcopatuum* мітрапаліт Галіцкі быў пазначаны ў 1303 г. на 81-м месцы (у той час – апошнім сярод мітрапалітаў) [25, s. 599; 11, с. 5].

Па версіі Б. М. Флоры, Ніфонт памёр каля 1305 г. [9; 18] (па версіі мітрапаліта Мануіла (Лемяшэўскага) і С. А. Чарапко – у 1307 г. [10; 20, с. 16]).

Яго пераемнікам павінен быў стаць ігумен Рацэнскага манастыра (на Валыні) *Пётр* (? – 1326). Яго асобу актыўна падтрымліваў князь Юрый Львовіч. У 1305–1306 гг. Пётр адправіўся для пастаўлення ў Канстанцінопаль. Крыху пазней у сталіцу Візантыі прыбыў уладзімірскі ігумен Геронцій, якога на пасаду мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі (якая на той час таксама стала вакантнай) вылучаў вялікі князь ўладзімірскі Міхаіл Яраславіч. Але кандыдатура Геронція была адхілена. У чэрвені 1308 г. патрыярх Апанас I здзейсніў хіратонію Пятра, але не на Галіцкую мітраполію, а на Кіеўскую і ўсяе Русі [17, с. 63; 6, с. 99].

І тут узнікае галоўнае пытанне – пра статус і далейшы лёс Галіцкай мітраполіі. Асобныя даследчыкі лічаць, што пасля смерці Ніфонта мітраполія была ліквідавана [14, с. 52], другія – што яна «пратрымалася да 1328 г.» [15, с. 10]. А даследчык М. Чубаты ўвогуле быў перакананы, што Пятра першапачаткова прызначалі галіцкім мітрапалітам, а затым – мітрапалітам Кіеўскім і ўсяе Русі. Тым самым ён «*аб’яднаў сваёй асобай абодвух мітрапалітаў, якія кананічна працягвалі існаваць як асобныя*» [21, с. 671].

Заблытанасць пытання аб лёсе Галіцкай мітраполіі прызнаваў і А. С. Паўлаў, які выказваў меркаванне, што Пётр мог быць першапачаткова пастаўлены галіцкім мітрапалітам, а потым – Кіеўскім і ўсяе Русі. «Можа быць, і патрыярх, выказаўшы здагадку з часам скасаваць Галіцкую мітраполію, паставіў св. Пятра ў мітрапаліты *правізорна*, гэта значыць так, каб ён, згодна з жаданнем свайго князя, быў спачатку галіцка-валынскім мітрапалітам, а потым, па дамове з вялікім князем паўночнай Русі і пры садзейнічанні самога патрыярха, зрабіўся і ўсерасійскім» [11, с. 10].

Даследчык А. С. Паўлаў заўважыў, што ў паўночнай Русі мітрапаліт Пётр з'явіўся толькі ў 1309 г., таму яго пастаўленне ў мітрапаліты ў мясцовых летапісах была аднесена да 1308 г. На думку гісторыка, гэта «магло адбыцца ад таго, *што там да 1308 года не хацелі прызнаць яго мітрапалітам*, і прынялі нарэшце толькі па фармальным патрабаванні патрыярха, звернутага да вялікага князя і ўсёй духоўнай іерархіі суздальскай зямлі». Менавіта гэтае прызнанне магло быць прынята паўночнымі летапісцамі «за самы факт пастаўлення Пятра ў мітрапаліты не толькі для паўднёвай, але і для паўночнай Русі» [11, с. 10].

Між тым ёсць меркаванні, што гэтая мітраполія заставалася вакантнай (незамешчанай). Такой пазіцыі прытрымліваўся дарэвалюцыйны прававед П. П. Сакалоў. Ён не выключаў, што *дэ-юрэ Галіцкая мітраполія працягвала сваё існаванне* аж да яе закрыцця намаганнямі мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі Феагноста (1328–1353). Гісторык нагадаў пра старажытную традыцыю ў Грэцкай царкве, калі пры адсутнасці годнага кандыдата на старэйшую мітрапалічую кафедру на яе мог быць пастаўлены (перайменаваны) мітрапаліт малодшай кафедры, якому і davучалася кіраванне. І да з'яўлення новага кандыдата на старэйшую кафедру захоўвалася царкоўная годнасць кожнай кафедры. П. Сакалоў меркаваў, што такая практыка назіралася і ў выпадку з Галіцкай мітраполіяй. Прыезд Пятра ў Канстанцінопаль дазволіў звярнуцца да гэтай традыцыі і дэ-факта аднавіць адзінства мітраполіі. Пры гэтым была задаволена просьба князя Юрыя Львовіча і захоўваліся царкоўныя каноны [16, с. 275; 6, с. 102].

Меркаванне П. П. Сакалова фактычна падтрымлівае і сучасны расійскі даследчык Б. Крычэўскі [5].

Падобная сітуацыя ў далейшым здарылася і з Навагрудска-Літоўскай мітраполіяй, якая ў асобныя перыяды таксама не мела мітрапаліта, але, на думку французскага даследчыка К. Цукермана, працягвала існаванне [19, с. 151–152]. Гэта значыць, што хаця галіцкія мітрапаліты пэўны час не прызначаліся, але сама структура мітраполіі (з епіскапіямі) захоўвалася.

Таму сярод даследчыкаў адсутнічае адзінства адносна вызначэння часу першага скасавання Галіцкай мітраполіі. Так, украінскі гісторык М. І. Гайкоўскі і расійскі даследчык Б. Крычэўскі называюць дату 1347 г. (г. зн. існавала ў 1303–1347 гг.) [2, с. 29; 5], польскі А. Мірановіч – 1335 г. (г. зн. існавала ў 1303–1335 гг.), а другі раз была скасавана ў 1347 г. (гэта значыць існавала ў 1341–1347 гг.) [8, с. 248]. Пры гэтым Б. Крычэўскі дадае, што хаця юрыдычна Галіцкая мітраполія існавала з 1303 да 1347 г., але ў асобныя перыяды (1308, 1328 гг.) яна «не юрыдычна» далучалася да мітраполіі Кіеўскай і ўсяе Русі [5].

Такім чынам, менавіта Галіцкая мітраполія (1303–1305 гг.) стала першым царкоўна-арганізацыйным утварэннем па-за межамі мітраполіі Кіеўскай і ўсяе Русі (з цэнтрам ва Уладзіміры-на-Клязьме), у склад якога ўваходзіла адна з беларускіх епархій – Тураўская. У той час гэта епархія

аб'ядноўвала тэрыторыю сучаснай Піншчыныі, Тураўшчыны і Наваградчыны. Адначасова ў склад Уладзімірскай (Валынскай) епархіі ўваходзіла Берасцейская зямля. Уключэнне ў склад Галіцкай мітраполіі гэтых тэрыторый стала вынікам складаных палітыка-дзяржаўных працэсаў сярэдзіны XIII – пачатку XIV ст., калі Турава-Пінскае княства і Берасцейская зямля трапілі пад моцны ўплыў або залежнасць ад Галіцка-Валынскай дзяржавы. Далейшы лёс гэтых зямель, а таксама Тураўскай епархіі з'яўляецца важным аспектам пры вызначэнні межаў новаўтворанай у 1315/1317 г. Літоўскай праваслаўнай мітраполіі з цэнтрам у Навагрудку.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Барсов, Т. В.* Константинопольский патриарх и его власть над руской церковью / Т. В. Барсов. – СПб.: Тип. П. А. Ремезова, 1878. – VIII, IV, 578, V с.

2. *Гайковський, М. І.* Галицька митрополія / М. І. Гайковський // Енциклопедія історії України. Т. 2: Г–Д / редкол.: В. А. Смолій (голова) та ін. НАН України. Інститут історії України. – К.: В-во «Наукова думка», 2004. – С. 29.

3. *Голубинский, Е. Е.* История русской церкви: в 2 т. Т. 2: Период второй, московский: От нашествия монголов до митрополита Макария включительно: Первая половина тома / Е. Е. Голубинский. – М.: Имп. О-во истории и древностей рос. при Моск. ун-те, 1900. – [4], VIII, 919 с.

4. *Краўцэвіч, А.* Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага (1248–1377): у 2 кн. / А. Краўцэвіч; навук. рэд. В. Голубеў. – Кн. 1: Ад пачатку гаспадарства да каралеўства Літвы і Русі (1248–1341 г.); Кн. 2: Дуумвірат Альгерда і Кейстута Гедымінавічаў (1341–1377 г.). – Гародня: А. Краўцэвіч; Уроцлаў: Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego we Wrocławiu, 2015. – 304 с. («Гарадзенская Бібліятэка»).

5. *Кричевский, Б. В.* Митрополичья власть в средневековой Руси (XIV век) [Электронный ресурс] / Б. В. Кричевский. – СПб.: Искусство-СПб, 2003 (Акад. тип. Наука РАН). – 262, [1] с.: ил. – (Серия: Территория культуры: история) // Азбука веры. – Режим доступа: https://azbyka.ru/otechnik/Istorija_Tserkvi/mitropolichja-vlast-v-srednevekovoj-rusi-iv-vek/. – Дата доступа: 10.06.2023.

6. *Любащенко, В.* Митрополит Петро (Ратенський) і майбутнє розділення Київської церкви / В. Любащенко // Średniowiecze Polskie i Powszechne. – Katowice, 2010. – T. 2 (6). – С. 92–117.

7. *Мейендорф, И. Ф.* Византия и Московская Русь: Очерк по истории церковных и культурных связей в XIV в. / И. Ф. Мейендорф; пер. с англ. (Самиздат). – Paris: YMCA-press, 1990. – 442 с.

8. *Миронович, А.* Епархиальная принадлежность Бреста до конца XVI в. / А. Миронович // Праваслаўная Беларусь. – Беласток: Бібліятэка Белар. Гіст. тав-ва, 2009. – С. 237–254.

9. Нифонт // Православная энциклопедия. – Режим доступа: https://www.pravenc.ru/text/2577725.html. – Дата доступа: 10.07.2023.

10. Нифонт, митрополит Галицкий (в рукописи митрополита Мануила отсутствует) // Мануил (Лемешевский), митроп. Русские православные иерархи, 992–1892 гг. – Режим доступа: https://azbyka.ru/otechnik/Manuil_Lemeshevskij/russkie-pravoslavnye-ierarhi-992-1892-gg-tom-2/391. – Дата доступа: 10.07.2023.

11. *Павлов, А. С.* О начале Галицкой и Литовской митрополий и о первых тамошних митрополитах по византийским документальным источникам XIV века / А. С. Павлов. – М.: Унив. тип., 1894. – 40 с. Отд. отт. из № 5 «Рус. обозрения».

12. *Падокшын, С. А.* Унія. Дзяржаўнасць. Культура: філасофска-гістарычны аналіз / С. А. Падокшын. – Мінск: Беларус. навука, 1998. – 111 с.

13. Памятники древнерусского канонического права: Ч. 1: (Памятники XI–XV в.) / ред. А. С. Павлов. – 2-е изд. – СПб.: Тип. М. А. Александрова, 1908. – 1472 с. и стб., разд. паг. (Рус. ист. биб-ка, изданная Импер. Археограф. комиссией; т. 6).

14. *Петрушко, В. И.* История Русской Церкви с древнейших времен до установления патриаршества: учеб. пособие / В. И. Петрушко. – 2-е изд.. – М.: Изд-во ПСТГУ, 2007. – 358 с.

15. *Рудович, І.* Коротка історія галицько-львівської єпархії на основі грецьких жерел та инших новійших підручників / І. Рудович. – Жовква: [Б. и.], 1902. – 58 с.

16. *Соколов, П.* Русский архиерей из Византии и право его назначения до начала XV века / П. Соколов. – Киев: Тип. И. И. Чоколова, 1913. – [2], IV, 578 с.

17. *Тихомиров, Н. Д.* Галицкая митрополия: церковно-историческое исследование / Н. Д. Тихомиров. – СПб.: Печ. Е. Евдокимова, 1895. – 189 с.

18. *Флоря, Б. Н.* Галицкая епархия / Б. Н. Флоря // Православная энциклопедия. – Режим доступа: https://www.pravenc.ru/text/161539.html. – Дата доступа: 10.07.2023.

19. *Цукерман, К.* Из ранней истории Литовской митрополии / К. Цукерман // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. арт. II міжнар. навук. канф. (Полацк, 17–18 крас. 2014 г.): да 20-годдзя археалагічных і этнаграфічных экспедыцый ПДУ: у 2 ч. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Полац. дзярж. ун-т; рэдкал.: Д. У. Дук [і інш.]. – Наваполацк: ПДУ, 2014. – Ч. 2. – С. 145–152.

20. *Черепко, С. А.* Православная церковь на Руси XIII–XV веков: борьба за митрополию / С. А. Черепко // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны: зб. навук. арт.; рэдкал.: Р. Р. Лазько [і інш.]. – Гомель: УА «ГДУ імя Ф. Скарыны», 2015. – Вып. 4. – С. 14–27.

21. *Чубатий, М.* Історія християнства на Русі-Україні: в 2 т. Т. I (до 1353 р.) / М. Чубатий. – Рим; Ню Йорк: Видання Українського Католицького Університету ім. св. Климента Папи., 1965. – 816 с. (Праці Греко-Католицької Богословської Академії).

22. Acta et diplomata graeca medii aevi sacra et profana / collecta et ediderunt F. Miklošich, I. Müller: in 6 vol. – Vindobonae: C. Gerold, 1860–1890. Vol. I. 1860. – 607 p.

23. *Chodynicki, K.* Kościół prawosławny a Rzeczpospolita Polska: zarys historyczny 1370–1632 / K. Chodynicki. – Warszawa: skład główny Kasa imienia Mianowskiego, Instytut Popierania Nauki, 1934. – XXI, [1], 632 s.

24. *Fijałek, J.* Średniowieczne biskupstwa Kościóła Wschodniego na Rusi i Litwie. Na podstawie źródeł greckich / J. Fijałek // Kwartalnik Historyczny. – T. X. Rocz. 3. – 1896. – S. 487–521; T. XI. Rocz. 1. – 1897. – S. 1–63.

25. *Geizer, H.* Ungedruckte und ungenügend veröffentlichte Texte der Notitiae episcopatuum, ein Beitrag zur byzantinischen Kirchen-und Verwaltungsgeschichte: Abhandlungen der kgl. bayerischen Akademie der Wissenschaften I / H. Geizer. – München: Akademie der Wissenschaften, 1900. – Klasse XXI. Bd. III. – 641 p.

**(Дата падачы: 08.02.2024 г.)**